# 52 спадзяванні на поспех

**19 верасня ў Саратаве распачаліся II Сусветныя Дэльфійскія гульні, у якіх прымае ўдзел і беларуская каманда.**

Як паведаміла кіраўнік беларускай дэлегацыі, начальнік аддзела па працы з таленавітай моладдзю Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Святлана Сусалка, Беларусь на прэстыжных спаборніцтвах прадставяць самыя адораныя і таленавітыя маладыя людзі краіны.

"Наша каманда возьме ўдзел у спаборніцтвах па пятнаццаці намінацыях. Да прыкладу, у намінацыі "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва" будзе змагацца наш малады кераміст Павел Ляонаў, саліст Тэатра оперы Рэспублікі Беларусь Ілля Сільчукоў разам са сваім "залатым" партнёрам-канцэртмайстрам Дашай Мароз будзе змагацца за перамогу ў складанейшай катэгорыі — "Акадэмічныя спевы", мазырскі калектыў пад кіраўніцтвам Аляксандра Зінкевіча "Алекса" прадэманструе сябе ў "Сучасным танцы"... Намінацый многа, але нам ёсць што паказаць, тым больш змагацца за перамогу будуць стыпендыяты Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі, дыпламанты і пераможцы шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, маладыя людзі з усіх куточкаў нашай краіны, якія ведаюць, што такое "барацьба".

Усе ўдзельнікі нашай каманды зараз накіраваны на сур'ёзнае спаборніцтва, але настрой трымаюць бадзёры і вясёлы", — падзялілася яна.

Усяго ж у склад беларускай дэлегацыі ўвайшлі 52 чалавекі.

Працягнуцца Дэльфійскія гульні да 25 верасня.

*Каманда "К", са свайго боку, жадае творчай зборнай Беларусі поспеху!*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ